К. А. Рэдзькова

# ПАЛІТЫКА БЕЛАРУСІЗАЦЫІ

Гісторыю Беларусі савецкага часу нялёгка ацаніць. Культура, або, як гаварылі ў у той час "культурнае будаўніцтва не ў меншай, а магчыма і ў большай частцы чым эканоміка і палітыка паспрабавала на сябя ўсе варыяцыі, то у адзін бок, то у другі, якія арганізоўвала партыя бальшавікоў. Воляй лёсу Беларусь неаднаразова станавілася эксперыментальным полем, на якім новая ўлада праводзіла свае "культурна-рэвалюцыйныя вопыты". Разглядаючы перадумовы палітыкі беларусізацыі, неабходна мець на ўвазе асаблівасці нацыянальных адносін на Беларусі на пачатку 1920-х гадоў і праблемы, якія існавалі па гэтаму пытанню. Па-першае, ішоў працэс тэрытарыяльнага самавызначэння беларускага народа, беларускай нацыі. У 1920-1923 гг. тэрыторыя БССР уключала толькі 6 паветаў былой Мінскай губерні. Але потым 3 сакавіка 1924 г. было заключана пагадненне паміж ЦВК РСФСР і ЦВК БССР аб перадачы (а лепш гаварыць - аб вяртанні) БССР 16 паветаў Віцебскай, Смаленскай і Гомельскай губерняў. У снежні 1926 г. БССР былі вернуты яшчэ два паветы: Гомельскі і Рэчыцкі. У выніку тэрыторыя БССР склала 152 854 кв.км, а колькасць насельніцтва – 5 млн чалавек. Па-другое, важна уявіць асаблівасці нацыянальнага складу тагачаснага насельніцтва Беларусі. Паводле перапісу 1926 г. беларусы складалі 80,6%, яўрэі 8,2, рускія 7,7, палякі 2, украінцы 0,7, латышы 0,3, літоўцы, немцы і татары -па 0,1%. Трэба і улічваць і тую акалічнасць што асноўная маса насельніцтва жыла ў вёсках. [1, 144.] Пасля кастрычніцкіх падзей 1917 г., як і раней, працягвалася і далейшае ўмацаванне рускага фактару ў Беларусі. У пачатку 1920-х гг. савецкая улада і кампартыя рэспублікі практычна нічога істотнага не здзейснілі для падняцця тут ролі нацыянальнай культуры тытульнага народа. Калі штосьці і рабілася ў гэтым напрамку, дык толькі па лініі наркаматаў народнай асветы і часткова земляробства, ці шчыра адданых беларускай справе людзей. Сярод нацыянальнай скіраванасці палітыкаў і інтэлегенцыі расла незадаволенасць станам культурнага жыцця ў Беларусі, ішоў інтэнсіўны абмен думкамі адносна шляхоў забеспячэння яму самабытнага характару. У першыню афіцыяльна заяўлена аб арганізацыі дзяржаўнымі органамі грамадскім жыцці на роднай мове яе народа ў снежні 1920 г. на ІІ Усебеларускім з'ездзе Саветаў. Наркамат павінен быў ужо у 1921 г. забяспечыць планамерны і паступовы пераход навуковых устаноў, дзе навучаліся дзеці -беларусы, на іх родную мову. У 1921 г. для распрацоўкі беларускай навуковай тэрміналогіі пры Наркампрасвеце была створана спецыяльная камісія. З 1922 г. на яе аснове пачаў сваю дзейнасць Інстытут беларускай культуры. Вузы, школы, бібліятэкі, прадпрыемствы пераходзілі на працу на беларускай мове. Паўсюднае выкарыстанне беларускай мовы абавязвала ў сур'ёз паклапаціцца пра стан яе фанетыкі і марфалоіі, складанне слоўнікай па розных галінах навукі, ачышчэнне лексікі ад празмерна вялікай колькасці свядома занесеных асімілятарамі паланізмаў і русізмаў. У гэтым напрамку дастаткова плённа працавала створаная ў 1921 г. пры Народным камісарыяце асветы БССР Навукова-тэрміналагічная камісія, на базе якой быў заснаваны 30 студзеня 1922 г. Інстытут беларускай культуры. Ад гэтага часу яшчэ больш актывізавалася дзейнасць па прыстасаванні беларускай мовы да выканання звязаных з яе дзяржўным статусам функцый. На працягу 1922-1930 гг. выйшлі з друку 24 выпускі "Беларускай навуковай тэрміналогіі". З канца 1920 - пачатку 1930-х гг. пачатку рэзка мяняцца палітычная сітуацыя ў Савецкай Беларусі. Асаблівасці палітычнай і культурным жыцці Беларусі, выкліканыя палітыкай беларусізацыі, не захапіла кіраўніцтва СССР, у якім поўным ходам ішло ўсталяванне таталітарнага рэжыму. Кіраўніцтва РКП (б), імкнучыся уніфікаваць палітычную, гаспадарчую і культурную жыццё на тэрыторыі ўсяго СССР, не магло дапусціць існавання якога-небудзь беларускага своеасаблівасці. У ходзе ажыццяўлення палітыкі беларусізацыі набыты велізарны і каштоўны вопыт, з якога вынікае, што ў першую чаргу трэба на належную вышыню ўзняць сацыяльную ролю роднай мовы тытульнай нацыі краіны. Аднак дасягнуць гэтага можна толью ў выпадку, калі беларускай мове нададзена прыярытэтнае месца ва ўсіх відах службовага справаводства, у народнай адукацыі, культуры, асабліва прафесійнай, ва ўсіх сродках масавай інфармацыі. Важнейшым фактарам да паспяховай рэалізацыі праблемы нацыянальнага адраджэння з'яўляецца карэнізацыя кадраў.

1. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917-1945гг./ А.Вабішчэвіч[і інш.]; рэдкал. М. Касцюк(гал. Рэдак- тар) і інш.- Мн.: Экаперспектыва, 2006.-613с.;іл
2. Чыгрынаў П.Г. Очерки истории Беларуси: Учеб. Посо- бие для вузов.-Мн.:Выш. Шк., 2000.-461 с.

*Редькова Коралина Александровна,* студентка ФИТУ БГУИР. redik@yandex.ru
*Научный руководитель: Зданкевич Екатерина Васильевна,* преподователь БГУИР

Библиотека БГУИР